# «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя». Конкурс біяграфічных твораў

ІНСТРУКЦЫЯ
Аб парадку арганізацыі і правядзення
Конкурсу біяграфічных твораў «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя», прысвечаных беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя (конкурс прымеркаваны да Году малой радзімы і 65-годдзя часопіса «Маладосць»)

## 1. Агульныя палажэнні

**1.1.** Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення Конкурсу біяграфічных твораў «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя», прысвечаных беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя (далей – Конкурс).

**1.2.** Мэты Конкурсу:

- развіццё ў сучаснай беларускай прозе гісторыка-біяграфічнага жанру;
- заахвочванне літаратараў да працы ў рэчышчы дакументальна-мастацкай творчасці;
- патрыятычнае выхаванне моладзі і папулярызацыя гісторыі айчыннай літаратуры.

**1.3.** Арганізатары Конкурсу (далей – Арганізатары): кафедра гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, рэдакцыя часопіса «Маладосць» Выдавецкага дома «Звязда» пры інфармацыйнай падтрымцы Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**1.4.** Журы Конкурсу складаецца з прадстаўнікоў Арганізатараў. У журы ўваходзяць: Людміла Сінькова — доктар філалагічных навук, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ, Ірына Багдановіч — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ, Ігар Запрудскі — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ, Святлана Воцінава — галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», Ірына Шаўлякова-Барзенка — кандыдат філалагічных навук, начальнік Адукацыйнага цэнтра Нацыянальнага інстытута адукацыі.

## 2. Парадак арганізацыі

**2.1.** Інфармацыя пра Конкурс абвяшчаецца ў рэспубліканскіх СМІ і на сайтах Арганізатараў.

**2.2.** Аб’ява аб конкурсе суправаджаецца Спісам імёнаў літаратараў XIX стагоддзя, жыццяпісы якіх прапануюцца для мастацкага асэнсавання (Дадатак 1).

**2.3.** Конкурс праводзіцца ў тры этапы:

- I этап — прыём заявак ад удзельнікаў (23 красавіка – 24 чэрвеня 2018 года, форма заяўкі – Дадатак 2);
- II этап – прыём конкурсных работ (1 мая – 31 кастрычніка 2018 года);
- III этап — праца Журы па вызначэнні пераможцаў (1 лістапада – 21 снежня 2018 года).

**2.4.** Вынікі Конкурсу абвяшчаюцца 21 снежня 2018 года.

**2.5.** Пераможцамі Конкурсу лічацца аўтары чатырох найлепшых тэкстаў, адабраных Журы.

**2.6.** Узнагароджанне пераможцаў адбываецца падчас урачыстай цырымоніі.

**2.7.** Кожны пераможца атрымлівае Дыплом і матэрыяльнае ўзнагароджанне.

**2.8.** Лепшыя конкурсныя творы публікуюцца ў часопісе “Маладосць” на працягу 2019 года.

**2.9.** Па выніках Конкурсу прадугледжваецца выданне кнігі лепшых гісторыка- біяграфічных твораў, прысвечаных беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя.

## 3. Парадак правядзення

**3.1.** Да ўдзелу ў Конкурсе запрашаюцца ўсе зацікаўленыя асобы без узроставых ці іншых абмежаванняў.

**3.2.** На Конкурс прымаюцца творы, якія не публікаваліся і не ўдзельнічалі ў іншых конкурсах. У адпаведнасці з п. 2.3. Інструкцыі прыёму конкурсных работ папярэднічае падача заяўкі ад удзельніка. Адзін удзельнік можа падаць на Конкурс адзін твор.

**3.3.** На Конкурс прымаюцца творы дакументальна-мастацкага жанру, прысвечаныя беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя, пры ўмове ахопу ўсяго жыццёвага і творчага шляху літаратара.

**3.4.** Форма твора — свабодная (эсэ, жыціе, літаратурная біяграфія, белетрызаваны біяграфічны нарыс, эпісталярная публіцыстыка, літаратурны партрэт, псеўдааўтабіяграфія, стылізаваныя мемуары, гістарычная аповесць і інш.), з арыентацыяй на займальнасць і чытацкія густы патэнцыяльнай адраснай аўдыторыі (вучні старшых класаў, студэнты і ўсе, хто цікавіцца гісторыяй роднай літаратуры).

**3.5.** Аб’ём твора — ад 40 да 80 тысяч знакаў (з прабеламі).

**3.6.** Мова Конкурсу — беларуская.

**3.7.** Работы падаюцца на Конкурс адным файлам у рэдактары Microsoft Word у фармаце doc, усе палі 2 см.

**3.8.** Асноўнаму тэксту павінна папярэднічаць наступная інфармацыя: імя і прозвішча ўдзельніка Конкурсу; імя і прозвішча асобы, якой прысвечаны твор; назва твора.

**3.9.** Файл павінен быць названы кірыліцай па форме: прозвішча канкурсанта_прозвішча героя.doc.

**3.10.** Заяўкі на ўдзел у Конкурсе і конкурсныя работы прымаюцца на адрас электроннай пошты: vdsd@tut.by. Пры парушэнні патрабаванняў, указаных у пп. 3.2.—3.6. Інструкцыі, работы да разгляду не прымаюцца.

## Дадатак 1

### Імёны літаратараў, жыццяпісы якіх прапануюцца для мастацкага асэнсавання

1. Вікенцій Равінскі (1786, Духаўшчынскі павет Смаленскай губерні, цяпер Духаўшчынскі раён, Расія — 1855) — паэт, драматург, найбольш верагодны аўтар паэмы «Энеіда навыварат».
2. Ян Баршчэўскі (~1794, в. Мурагі Полацкага павета, цяпер Расонскі раён, Беларусь — 12 сакавіка 1851, Чуднаў, цяпер Украіна) — празаік, паэт і выдавец.
3. Ян Чачот (24 чэрвеня 1796, в. Малюшычы Наваградскага павета, цяпер Карэліцкі раён, Беларусь — 23 жніўня 1847, мястэчка Ротніца, цяпер Друскенінкай, Літва) — паэт, філамат, фальклярыст, этнограф і драматург, сябра Адама Міцкевіча.
4. Франц Савіч (1815, в. Вяляцічы Пінскага павета, Беларусь — 1845, мястэчка Янушпаль Валынскай губерні, Украіна) — паэт, публіцыст, мемуарыст, удзельнік вызваленчага руху.
5. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (4 лютага 1808, фальварак Панюшкавічы Бабруйскага павета, цяпер Бабруйскі раён, Беларусь — 29 снежня 1884, Люцынка Мінскага павета, цяпер Валожынскі раён Мінскай вобласці) — паэт, драматург, заснавальнік нацыянальнага тэатра, класік новай беларускай літаратуры.
6. Уладзіслаў Сыракóмля, сапраўднае імя Людвік Кандратóвіч (29 верасня 1823, фальварак Смольгаў Бабруйскага павета, цяпер в. Смольгава Любанскага раёна — 15 верасня 1862, Вільня, Літва) — паэт, публіцыст, драматург, крытык, перакладчык, этнограф.
7. Вінцэсь Каратынскі (чэрвень 1831, в. Селішча каля Любчы, цяпер Карэліцкі раён, Беларусь — 7 лютага 1891, Варшава, Польшча) — паэт, перакладчык, публіцыст.
8. Пранціш Вуль, сапраўднае імя Элегій-Францішак Карафа-Корбут (21 красавіка 1835, Віцебск — 1880-я, Варшава?) — паэт і публіцыст, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. на Віцебшчыне.
9. Кастусь Каліноўскі (2 лютага 1838, в. Мастаўляны Гродзенскага павета, цяпер Беластоцкае ваяводства, Польшча — 22 сакавіка 1864, Вільня) —

рэвалюцыянер-дэмакрат, публіцыст і паэт, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве.

10. Альгерд Абуховіч (6 жніўня 1840, в. Калацічы Бабруйскага пав., цяпер Глускі раён Магілёўскай вобласці — 22 жніўня 1898, Слуцк) — паэт, байкапісец, мемуарыст і перакладчык.
11. Францішак Багушэвіч (21 сакавіка 1840, фальварак Свіраны Віленскага павета — 28 красавіка 1900, в. Кушляны, цяпер Смаргонскі раён) — паэт, празаік, публіцыст і перакладчык, класік новай беларускай літаратуры.
12. Эліза Ажэшка (6 чэрвеня 1841, в. Мількаўшчына Гродзенскага павета — 18 мая 1910, Гродна) — празаік, публіцыст, аўтар апавяданняў і аповесцей пра жыццё беларускага сялянства і шляхты, сяброўка Ф. Багушэвіча.
13. Зоф'я Манькоўская (26 лістапада 1847, в. Дарагавіца, цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці — 24 верасня 1911, в. Дарагавіца) — паэтка і перакладчыца.
14. Янка Лучына, сапраўднае імя Ян Неслухоўскі (6 ліпеня 1851, Мінск — 28 ліпеня 1897, Мінск) — паэт, нарысіст і перакладчык.

**Дадатак 2**

**Заяўка ўдзельніка**
Прозвішча, імя, імя па бацьку
Год нараджэння
Месца пражывання
Род заняткаў
Нумар тэлефона і электронны адрас
Выбраная асоба са спісу літаратараў